# [РУП «Белпошта» праводзіць конкурс сачыненняў эпісталярнага жанру]

Беларуская пошта запрашае прыняць удзел у конкурсным адборы сачынення ад Рэспублікі Беларусь для ўдзелу ў 54-м Міжнародным маладзёжным конкурсе твораў эпісталярнага жанру ў 2025 годзе, арганізаваным Сусветным паштовым саюзам.

Тэма конкурсу: «Уявіце, што Вы - акіян. Напішыце каму-небудзь ліст, у якім растлумачце, чаму і як людзі павінны клапаціцца пра Вас».

Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца ўдзельнікі ва ўзросце ад 9 да 15 гадоў (уключна). Сачыненне павінна быць напісана ад рукі на рускай ці беларускай мове і можа змяшчаць ілюстрацыі кандыдата. Аб'ём не павінен перавышаць 800 слоў.

Удзельнік конкурсу павінен прадставіць сачыненне ў філіялы РУП «Белпошта» або вытворчасць «Мінская пошта» па тэрытарыяльнай прыналежнасці па 3 красавіка 2025 г. (уключна).

Больш падрабязна з умовамі правядзення конкурсу можна азнаёміцца на BELPOST.BY

Малюнак



---

**Source URL:**
*https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/rup-belposhta-pravodzic-konkurs-sachynennyau-epistalyarnaga-zhanru*